# ВЁСКІ БУДУЧЫНІ

## Карэспандэнт «МС» пацікавілася, як адбываецца развіццё малых населеных пунктаў на прыкладзе Шклоўскага раёна



Маленькім населеным пунктам не хапае такіх дабрадзеяў, як Сямён Зорыч, фаварыт Кацярыны Вялікай, якая падаравала яму ў XVIII стагоддзі Шклоў.

**Кіраўнік краіны падчас свайго апошняга візіту ў пасёлак гарадскога тыпу Копысь, што на Аршаншчыне, заклікаў кіраўнікоў абласцей браць прыклад з гэтага аграгарадка і кожны год прыводзіць у парадак адзін-два населеныя пункты на сваёй тэрыторыі. Ідэя ў тым, што гэта дасць магчымасць за некалькі гадоў стварыць прывабныя ўмовы жыцця на сяле, а людзям не захочацца шукаць лепшай долі ў той жа сталіцы.**



Першы намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама Іван РАДОЎСКІ: «Пакуль аналага таму, што мы ствараем, у краіне няма».

### Шклоўшчына паказвае прыклад

Вядомая рэч, што без моцнай гаспадаркі, дзе людзі будуць працаваць і атрымліваць годную зарплату, зрабіць вёску будучыні праблематычна. Сёння на тэрыторыі Шклоўскага раёна ствараецца холдынг «Купалаўскае», у склад якога ўвойдуць тры таварыствы — Вялікія Славені, Амкадор-Шклоў і Новагарадзішчанскае.

— Гэта ўсё гаспадаркі сярэдняга ўзроўню, тыповыя для Беларусі, — удакладняе **першы намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама Іван РАДОЎСКІ.**— Яны выбраны, каб потым іншым было лягчэй пераймаць вопыт. Пакуль мы ў гэтым першапраходцы. Аналага таму, што ў нас будзе, пакуль у краіне няма. Перад намі пастаўлена задача стварыць вялікую аграпрамысловую кампанію з высокай культурай вытворчасці.



Жыхары таксама ствараюць прыгажосць.

На погляд першага намесніка старшыні, передумовы для стварэння такога холдынга даўно ўжо саспелі.

— Мы разумеем, што ў сельскіх гаспадарках трэба зніжаць выдаткі, — разважае ён. — Але, пагадзіцеся, несправядліва, што перапрацоўка злоўжывае працай селяніна. Тое ж малако закупаецца па адной цане, а ў магазіне прадаецца па значна вышэйшай. Асабліва тыя найменні, якія маюць вялікі працэнт тлушчу, — вяршкі, смятана і іншыя. З літра малака завод выпускае шмат рознай малочнай прадукцыі і кожную па сваёй цане. Наш холдынг дасць магчымасць селяніну і перапрацоўцы канкурыраваць на роўных.

Цяпер поўным ходам ідзе стварэнне аптымальных умоў для функцыянавання новага ўзроўню аб'яднання. Таварыства «Амкадор-Шклоў» узбуйнілася за кошт далучэння яшчэ аднаго — «Новае юбілейнае». На яго фермах у Сліжах дабудавалі комплекс, і ўжо ідзе яго камплектацыя нецелямі. Вядзецца рэканструкцыя адкормачнага комплексу пад сучасныя тэхналогіі вырошчвання цялят у Вялікіх Славенях.

— За апошні год была перагледжана тэхналогія вытворчасці і людзі сталі заўважаць, што сітуацыя вельмі змянілася ў лепшы бок, — кажа Іван Яўгенавіч. — Цяпер жорстка вытрымліваецца міністэрскі рэгламент па вытворчасці сельгаспрадукцыі, і пагалоўе цялят стала зусім іншае. А з добрага цяляці, як вядома, атрымліваецца добрая карова. Было складана пераканаць людзей, якія не вельмі ахвотна прымаюць усё новае. У савецкі час гаспадарка была вельмі моцная. З ёй звязана дзейнасць трох Герояў Сацыялістычнай Працы. У людзей свае традыцыі, свая псіхалогія. Але сёння нельга жыць па савецкіх мерках. Трэба мяняцца і да чагосьці імкнуцца, рабіць прадукцыю з мінімальнымі выдаткамі.

### Аграгарадкі мяняюць твар

Ужо распрацаваны генеральныя планы трох вёсак будучыні, сумешчаныя з дэталёвым іх планаваннем, — гэта аграгарадкі Малыя Славені і Любінічы на тэрыторыі Славенскага сельсавета і Акунёўка — Гарадзішчанскага.

— Менавіта за аграгарадкамі будучыня, трэба ўкладваць сродкі ў іх развіццё, — лічыць **старшыня Шклоўскага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр ДАВЫДОВІЧ.** — Там ёсць уся інфраструктура: крама, ФАП, амбулаторыя, пошта, школа... Маленькія вёскі паступова знікаюць, бо людзі пераязджаюць туды, дзе ёсць умовы для жыцця. Толькі сёлета мы пахавалі больш за 260 старых пустуючых дамоў. І работы працягваюцца.

Аграгарадок Малыя Славені — цэнтр Славенскага сельсавета, на тэрыторыі якога 18 населеных пунктаў з насельніцтвам 1804 чалавекі. Сёння аграгарадок нагадвае вялікую будоўлю. На момант нашага прыезду ішла падрыхтоўка пляцоўкі для заняцця міні-футболам. Непадалёк ужо ўсталяваныя прыстасаванні для заняцця воркаўтам.

Перамены відаць няўзброеным вокам. На дарозе ляжыць свежы асфальт, пешаходныя дарожкі акуратна вымашчаны пліткай, ідзе падрыхтоўка для асфальтавання двара двухпавярховага жылога дома. Насельніцтва таксама ахоплена будаўнічым бумам. Агароджы пафарбаваны, каля дамоў гумавыя лебедзі, на ўваходах падвясныя вазоны з кветкамі.

Сельвыканкам — сацыякультурны цэнтр тутэйшага жыцця, аб чым яскрава сведчаць размешчаныя на ўваходзе шыльды. У будынку разам суіснуюць адміністрацыя гаспадаркі, сельсавет, пункт аховы правапарадку, клуб, бібліятэка, банк, пошта, Дом рамёстваў. Некаторыя памяшканні пакуль на рамонце.

**Выконваючы абавязкі старшыні Славенскага сельсавета Мацвей БАБРОЎ** гасцінна запрашае паглядзець умовы. На ўваходзе — генеральны план аграгарадка: прыгожыя ўтульныя домікі, ліхтары, шмат зелені, спартыўныя пляцоўкі. Тут сапраўды хочацца жыць.

**Бібліятэкар Людміла СЯРГЕЕНКА** з задавальненнем паказвае, чым жыве Дом рамёстваў, які пачаў працаваць зусім нядаўна. У шафах і на палічках шмат твораў народных умельцаў — ручнікі, карціны, дробныя вырабы. Людміла Сяргеенка сама захапляецца арыгамі і можа навучыць гэтаму мастацтву любога. А хутка прыедуць у вёску і іншыя майстры. Тут з нецярпеннем чакаюць пяцярых маладых спецыялістаў, якія будуць выкладаць мясцовым жыхарам азы народнай творчасці.

— На прыкладзе Копысі акультурваем свой населены пункт, — кажа Мацвей Баброў. — Працуем над зносам старых пустуючых дамоў, з пачатку года прыбралі аж 79. Нават адна кур'ёзная гісторыя адбылася. У паўразбураным доме была прапісана жанчына, якая жыла ў другой вёсцы з грамадзянскім кавалерам. Я параіў мужчыну ажаніцца. Ён паслухаўся, і цяпер яны — сям'я. Жанчына прапісалася ў яго і цяпер такая шчаслівая. А яе паўразбураны дом мы па яе ж просьбе знеслі.

Мацвей Баброў, дарэчы, да нядаўняга часу быў гарадскім жыхаром, але, калі прапанавалі пасаду выконваючага абавязкі старшыні, нават не раздумваў — пагадзіўся. Прыехаў на новае месца жыхарства і не шкадуе. Гэта ж такая прастора для дзейнасці! Вядома, бываюць цяжкія моманты, адчуваецца недахоп вопыту. Але заўсёды можна звярнуцца па дапамогу да калег.

### Кожнаму фермеру — па вёсцы

Наступны населены пункт — Заброддзе. Ён не трапіў у праграму па стварэнні холдынга, але і тут віруе жыццё. І задае яму тон невялічкая прыватная фірма.




Мацвей Баброў памяняў горад на вёску і не шкадуе.

Аляксандр Давыдовіч запрашае пазнаёміцца з ёй бліжэй, каб зразумець, хто дапамагае развіваць маленькія населеныя пункты.

Наогул, ад прадпрымальных людзей, кажа дэпутат, раёну вельмі вялікая дапамога. Сёлета рашэннем райвыканкама за фермерамі замацавалі вёскі, якія размешчаны побач з іх землямі. Яны там парадак наводзяць, хмызняк выразаюць, акультурваюць тэрыторыю. А заадно нясуць шэфства над адным або некалькімі грамадзянскімі могілкамі. Больш паспяховыя бізнесмены дапамагаюць яшчэ і дзіцячым садкам, школам.

Вёскам, на жаль, не хапае інвестараў. І калі яны з'яўляюцца, іх тут, як той казаў, носяць на руках. Пра Ігара Дросу і яго кампаньёна Аляксея Азарэвіча, якія стварылі ў Заброддзі прыватнае прадпрыемства «Азартум-аўта» і займаюцца вырошчваннем дэкаратыўных і пладовых раслін, старшыня райсавета кажа з асаблівай павагай: «Людзі ўзялі зямлю, распрацоўваюць пустуючыя ўчасткі, ствараюць рабочыя месцы. Паболей бы нам такіх».

— Чацвёрты год працуем. У нашым гадавальніку дзясяткі сартоў хвойных, ліставых, пладовых раслін і руж. Уся Беларусь купляе, — расказвае Ігар. — Людзям падабаецца, што мы побач, яны бачаць, як усё гэта расце, прыходзяць да нас з дзецьмі на адпачынак. Толькі адных руж у нас 25 тысяч кустоў. Шмат экзотыкі. Нават жоўты бэз ёсць. Раней спраўляліся сваімі сіламі, а летась змаглі працаўладкаваць 22 мясцовыя жыхары.

Сам Ігар з Малдовы, расказвае, што 9 гадоў у Маскве займаўся гэтым бізнесам. Але не вырошчваў, а прадаваў. У Шклоўскім раёне для яго адкрыліся новыя магчымасці. І ён гэтаму рады.



Аляксей АЗАРЭВІЧ на плантацыі руж.

— Цяпер мяне ў Маскву не зацягнеш, — усміхаецца ён. — Там грошы вялікія, але ты не жывеш — проста існуеш. Адпачываць ёсць дзе, але няма калі. А тут грошы на другі план адышлі. Затое адчуванне сваёй годнасці з'явілася. Да таго ж усё побач — работа, дом, сям'я, сябры. Увесь дзень на свежым паветры і ніякага шуму. Праца не лёгкая, але, калі бачыш, што ў цябе атрымліваецца, ад стомы і следу не застаецца.

Гаспадары гадавальніка ўпэўненыя, што будучыня маленькіх населеных пунктаў цалкам залежыць ад моладзі. Трэба, каб у кожнай вёсцы быў арганізатар з ліку маладых, каб ён ведаў кожную сям'ю і чым яна жыве. І прыдумваў, запрашаў, здзяйсняў. Тады і людзям стане цікава адпачываць дома, а не ехаць кудысьці за блізкі свет. Але прывабліваць маладых і ініцыятыўных трэба не словамі, а справай. Даць жыллё, добрую зарплату, і тады справы пойдуць самі сабой.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
zigulya@zviazda.by